билетных кассиров опытными работниками, провели текущий ремонт залов для пассажиров и комнат отдыха, но посадочные платформы увеличены не были, как не было увеличено и количество мест для предварительной продажи билетов.

Круг поднимавшихся вопросов был широк. Так, выполняя наказы избирателей постоянная комиссия по промышленности, транспорту и связи Гродненского облсовета в 1977 г. рекомендовала выделить лимиты на строительство жилья для железнодорожников Лиды. Однако большим препятствием к реализации депутатских предложений было отсутствие необходимых средств и материалов у БЖД. Главной проблемой, которой занималась постоянная комиссия по транспорту и связи Гродненского горсовета в декабре 1978 г., стала эффективность использования железнодорожного транспорта по перевозкам грузов.

В центре внимания постоянной комиссии Брестского облсовета по дорожному хозяйству, транспорту и связи в марте 1978 г. оказалась работа Барановичского отделения БЖД, которое выполняло мероприятия об улучшении функционирования железнодорожного транспорта области. Железнодорожниками были разобраны вопросы совершенствования работы по использованию вагонов на подъездных путях предприятий. С помощью горисполкомов и райисполкомов было повышено качество обслуживания пассажиров и укреплена трудовая дисциплина. Отделением была увеличена производительность локомотива и вагона, увеличен средний вес грузового поезда и сокращён оборот грузового вагона.

**Заключение.** Изучение деятельности депутатских комиссий БССР по решению социально-экономических вопросов, в первую очередь транспортных, позволило проанализировать эффективность тех или иных форм их работы, определить как наиболее распространённые, так наиболее перспективные направления достижения планировавшихся результатов.


1. Государственный архив Гомельской области. – Ф. 296. Оп. 1. Д. 833.
2. Ушацкий, И. На страже трудовых прав / И. Ушацкий // Охрана труда и социальное обеспечение. – 1970. – № 4. – С. 38.
3. Государственный архив Минской области. – Ф. 2. Оп. 9. Д. 1479.
4. В Постоянной комиссии по транспорту и связи Верховного Совета БССР // Советская Белоруссия. – 1970. – 14 апреля. – С. 3.
5. Национальный архив Республики Беларусь. – Ф. 968. Оп. 1. Д. 861.


## ПЕТРАГРАДСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ БСГ І ЎНУТРЫПАЛІТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА ЛЕТАМ 1917 Г.


*А.Д. Тогулева*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Лютаўская рэвалюцыя ў 1917 г. знішчыла царскае самадзяржаўе. Гэта стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця ў краіне дэмакратычных асноў і адраджэння нацыянальных рухаў прыгнечаных народаў Расіі, у тым ліку і беларускага. Беларусы, як і астатнія народы Расійскай імперыі, атрымалі надзею дабіцца калі ня поўнай незалежнасці, то ва ўсякім разе аўтаноміі. Гэта надзея стала цэнтрам палітычнай барацьбы ў беларускім крае, актывізаваўшы нацыянальна-вызваленчы рух, які ў сваю чаргу з’явіўся састаўной часткай агульна-дэмакратычнай барацьбы беларускіх працоўных.

Беларуская Сацыялістычная Грамада аднавіла сваю дзейнасць адразу пасля Лютаўскай рэвалюцыі. У звяржэнні самадзяржаўя і ўстанаўленні дэмакратычнага ладу ў Расіі яна бачыла ўмовы для сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення беларусаў. На партыйнай канферэнцыі 4 чэрвеня 1917 г. ў Петраградзе БСГ вызначыла прыярытэты па неадкладных пытаннях палітычнага жыцця краіны і абмеркавала задачы партыі ў нестабільных палітычных умовах.

Мэта – прааналізаваць вынікі партыйнай канферэнцыі 4 чэрвеня 1917 г. ў Петраградзе і іх уплыў на лес Беларускай сацыялістычнай грамады.

**Матэрыял і метады.** У якасці матэрыяла былі выкарыстаны дакументы з фондаў НАРБ, пастановы канферэнцыі БСГ, артыкулы дзеячоў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху З.Жылуновіча, А.Бурбіса. Рэалізаваны лагічныя метады даследавання, а таксама метады гістарычна-параўнальнага і сістэмна-комплекснага аналізу навуковай літаратуры і крыніц.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Актывізацыя левых элементаў, хуткая змена палітычнай сітуацыі вымушалі БСГ мяняць тактыку, прыстасоўвацца да новых палітычных умоў. З гэтай

Рэпазіторый ВДУ

мэтай 4 чэрвеня 1917 г. у Петраградзе была склікана канферэнцыя партыі, на якую прыслалі дэлегатаў 17 арганізацый БСГ, у тым ліку Пскоўская, Мінская, Віцебская, Пецярбургская, Асіповічская і інш. Ад Масквы прысутнічаў дэлегат з дарадчым голасам (1). Пад уплывам левага крыла, якое абапіралася на рабочых-беларусаў петраградскіх заводаў, салдат і матросаў, канферэнцыя паспрабавала выпрацаваць новую тактыку партыі з улікам развіцця рэвалюцыі і сфармуляваць некаторыя праграмныя патрабаванні.

Кіраўніцтва БСГ прадставіла на абмеркаванне праект праграмы партыі, у якім адзначалася: "Беларуская Сацыялістычная Грамада мае сваёй канчатковай мэтай ажыццяўленне сацыялістычнага ладу шляхам развіцця класавай барацьбы і сацыяльнай рэвалюцыі" (2).

У палітычнай і сацыяльна-эканамічнай галінах праект, па сутнасці, паўтарыў старыя праграмныя патрабаванні БСГ, прынятыя ў 1906 г.: свабода слова, друку, сходаў; раўнапраўе ўсіх грамадзян без адрознення пола, класа, нацыянальнасці і рэлігіі; устанаўленне ў Расіі дэмакратычнай федэратыўнай рэспубліцы; выбарнасць адміністрацыі, судзей; прапаганда сацыялізацыі ўсёй прамысловасці; увядзенне 8-гадзіннага працоўнага дня; мінімальнай заработнай платы і інш (2).

Па аграрнаму пытанню праект прадугледжваў наступныя патрабаванні: 1/забарона куплі і продажу зямлі, канфіскацыя зямлі ўдзельнай, панскай і інш. і пераход яе без выкупу ў карыстанне ўсяго народу, што на ёй працуе; 2/усёй зямлёй на Беларусі павінна загадваць Беларуская Краёвая Рада, яна сама парадкуе кавалкамі, патрэбнымі на перасяленне, а рэшту адабранай зямлі перадае мясцовым органам самакіравання (3).

Па нацыянальнаму пытанню БСГ ставіла задачу дамагацца шырокага самакіравання Беларусі з заканадаўчым органам - Краёвай Радай, выбранай на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога, тайнага і прапарцыянальнага выбарчага права; адсутнасці мытных межаў паміж Беларуссю і іншымі часткамі будучай Расійскай Федэрацыі; поўнага палітычнага і эканамічнага раўнапраўя ўсіх нацыянальнасцей на тэрыторыі Беларусі; развіцця нацыянальнай культуры і заканадаўчага прызнання беларускай мовы ў школах, а таксама ў дзяржаўных і грамадскіх установах Беларусі (3).

На канферэнцыі было вырашана ўхваліць гэты праект праграмы БСГ, а таксама зазначана, што ён павінен быць яшчэ зацверджаны на з'ездзе Грамады, які быў назначан на пачатак ліпеня (3).

Што тычыцца тактыкі партыі ў змяніўшыхся абставінах, то яна нягледзячы на намаганні левага крыла канферэнцыі, засталася нязменнай. БСГ зноў адкладвала вырашэнне ўсіх сацыяльных праблем да Устаноўчага сходу. Заява яе аб тым, што галоўнай яе мэтай з'яўляецца "ажыццяўленне сацыялістычнага ладу шляхам развіцця класавай барацьбы і сацыяльнай рэвалюцыі", была хутчэй палітычным лозунгам, разлічаным на прыцягненне на бок партыі шырокіх мас насельніцтва Беларусі. На справе ж БСГ працягвала падтрымліваць буржуазную праграму Часовага ўрада.

Па пытаннях вайны і міру Грамада таксама засталася на старых пазіцыях. "Нізважаючы на цяжкае становішча і нязмерную пакуту роднай старонкі, канферэнцыя БСГ лічыць, што пакуль ваюючыя гасударствы ня аслабаніліся ад гібельнага ўплыву мілітарызму, Расійская Рэвалюцыйная Армія павінна цвёрда стаяць на варці свае вольнасці" (3).

На гэтай канферэнцыі БСГ выступіла супраць утварэння нацыяльных палкоў, бо яны "патрэбны хіба толькі буржуазным і контррэвалюцыйным элементам". Канферэнцыя катэгарычна пратэставала супраць збірання беларусаў да польскіх, літоўскіх і іншых легіёнаў (3).

Канферэнцыя выбрала ЦК партыі, у склад якога ўвайшлі 12 чалавек: ад Петраграду - П.Бадунова, З.Жылуновіч, Я.Варонка, К.Душэўскі, А.Будзька, Барысёнак і Лузгін; ад правінцыі - А.Смоліч /Мінск/, У.Ігнатоўскі /Яраслаў/, Хоценка /Пскоў/, Я.Колас /Перм/, А.Бурбіс /Масква/, Астроўскі /Слуцк/, М.Мялешка /Віцебск/ (3).

У склад прэзідыума ўвайшлі: З. Жылуновіч, П.Бадунова, К.Душэўскі, Барысёнак і Лузгін – усе прадстаўнікі з Петраграда. Было вырашана перавесці ЦК з Мінска ў Петраград і лічыць яго часовым, пакуль яго не зацвердзіць з'езд партыі, або не выберуць новага (3).

Аднак арганізацыйныя пастановы канферэнцыі, а асабліва выбары цэнтральных органаў партыі, выклікалі адмоўную рэакцыю з боку Маскоўскай арганізацыі БСГ і яе старшыні А.Бурбіса. Ён звярнуўся ў рэдакцыю "Известий Петроградского Совета Солдатских Депутатов" з заявай, што перавод ЦК БСГ з Мінска ў Петраград з'яўляецца нейкім "непаразуменнем", т.я. "ЦК был избран на втором съезде в 1906 г., и подписавший это опровержение, член этого ЦК



Рэпазіторый ВДУ

знает, что все это какое-то недоразумение и все это несогласно с истиной" (4). Падобная заява была надрукавана і ў "Вольнай Беларусі" (5).

У адказ на гэтыя абвяржэнні З. Жылуновіч таксама звярнуўся ў рэдакцыю "Вольнай Беларусі" з просьбай надрукаваць яго ліст, у якім ён адказвае на абвінавачанні Маскоўскай арганізацыі. Ён кажа, што 25 сакавіка ў Мінску ў час арганізацыйнай канферэнцыі БСГ было абрана Цэнтральнае Бюро партыі, у склад якога разам з іншымі грамадоўцамі ўвайшоў і А.Бурбіс. Гэта ЦБ павінна было застацца ў Мінску і весці ўсю арганізацыйную працу, у тым ліку і скліканне другой канферэнцыі або з'езда партыі. Згодна з гэтым Бюро даручыла Петраградскай арганізацыі склікаць другую канферэнцыю на 3 чэрвеня, што і было зроблена. Менавіта на гэтай канферэнцыі і былі прыняты тыя пастановы, якія так не спадабаліся Маскоўскай арганізацыі. Нарэшце З.Жылуновіч паведамляе: "Конференция, проведя большую организационную работу удовлетворила всех. Но почему-то не пришлась по вкусу председателю МК дзядзьку А. Бурбису, который не мог по каким-то причинам приехать сам. Разозлившись, по личным причинам он повёл травлю конференции и начал воскрешать ЦК 1906 г., который Минская конференция не видела, выбирая ЦБ и выбранный в это Бюро Бурбис также ничего не имел против.

Теперь, считая, что МК ведет грязную работу травли ЦК, последний постановил временно прервать с ним отношения" (6).

Але на гэтым справа не скончылася. А. Бурбіс ад імя Маскоўскага Камітэта БСГ і ў далейшым абвінавачваў Петраградскую канферэнцыю і ЦК, які былі на ёй выбраны "у легкадумным поглядзе на паважаную партыйную працу" (7) і рабіў спробы склікаць трэці партыйны з'езд. Спачатку яго назначалі на 21-23 ліпеня (7), потым на 17 жніўня (8), але гэтыя спробы не далі ніякіх вынікаў.

**Заключэнне.** Такім чынам, у новых палітычных умовах, якія склаліся ў выніку Першай сусветнай вайны і Лютаўскай рэвалюцыі, Беларуска сацыялістычнай грамадзе як палітычнай партыі неабходна было выпрацаваць новую стратэгію і тактыку, вызначыць сваю пазіцыю па самых важных эканамічных, сацыяльных і палітычных пытаннях. Праект партыйнай праграмы, разгледжаны на Петраградскай канферэнцыі, па сутнасці паўтараў сацыяльна-эканамічныя і палітычныя патрабаванні, прынятыя на II з'ездзе БСГ у 1906г. БСГ засталася на пазіцыі падтрымкі Часовага ўрада і адкладвала рашэння выжных задач да склікання Устаноўчага сходу. Новай з'явай для партыі стала унутрыпартыйная барацьба. Гэтая спрэчка паміж кіраўнікамі БСГ сведчыла аб адсутнасці арганізацыйнага і ідэйнага адзінства ў Грамадзе, а таксама вельмі перашкаджала партыйнай працы і падрывала аўтарытэт партыі сярод шырокіх народных мас.


1. НАРБ. Ф.60, воп.3, спр. 749, арк. 53.
2. НАРБ. Ф.60, воп.3, спр.81, арк. 20.
3. Пастановы Канферэнцыі БСГ // Вольная Беларусь. – 1917. –27 ліпеня. – С.3.
4. НАРБ.Ф.60, воп.3, спр.741, арк.14.
5. НАРБ.Ф.60-спр.749, арк.52.
6. НАРБ.Ф.60, спр.749, арк.52–53.
7. НАРБ. Ф.62, воп.1, спр.109, арк. 12.
8. НАРБ. Ф.62, воп.1, спр.109, арк. 10.


## СОВЕРШЕНСТВОВАНИЕ МАРКЕТИНГОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОРГАНИЗАЦИИ (ПРЕДПРИЯТИЯ) ПИЩЕВОЙ ПРОМЫШЛЕННОСТИ


*Л.Ф. Трацевская*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


Стабильное социально-экономическое развитие Республики Беларусь и ее регионов в значительной мере определяется устойчивым, эффективным функционированием отдельных промышленных организаций (предприятий) и фирм. Именно они осуществляют изготовление продукции, выполняют работы и оказывают услуги, необходимые как для производственных целей, так и для нужд населения. От того, как используют данные организации (предприятия) свой потенциал, насколько эффективна их маркетинговая деятельность, зависит экономическое развитие Беларуси на макро- и микроуровне, что определяет актуальность проведенного исследования.

Репозиторий ВГУ